# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ



*ў апрацоўцы Якуба Коласа*

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ

*ў апрацоўцы Якуба Коласа*

Мінск
Выдавецкі дом «Звязда»
2025

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Б43

Мастак
*Алег Грубін*

*Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту*

ISBN 978-985-575-671-3

© Грубін А. Б., ілюстрацыі, 2021
© Афармленне. РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2021

# Каза ў арэхах

Пайшоў казёл з казою арэхі збіраць. Казёл шчыпле арэхі, каза падбірае. Нашчыпалі тры мяхі, а чацвёрты — шалупіння.

— Ну, каза, дамоў пойдзем.

— Не пайду, — кажа каза.

Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакай жа, каза, нашлю я на цябе ваўкоў... Ваўкі, ваўкі, ідзіце казу есці!

Не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакайце ж, ваўкі, нашлю я на вас мядзведзя... Мядзведзь, мядзведзь, ідзі ваўкоў душыць!

Не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, ваўкі не ідуць казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакай жа, мядзведзь, нашлю я на цябе стральцоў... Стральцы, стральцы, ідзіце мядзведзя біць!

Не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, ваўкі не ідуць казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакайце ж, стральцы, нашлю я на вас вяроўкі... Вяроўкі, вяроўкі, ідзіце стральцоў вязаць!

Не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакайце ж, вяроўкі, нашлю я на вас агонь... Агонь, агонь, ідзі вяроўкі паліць!

Не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакай жа, агонь, нашлю я на цябе ваду... Вада, вада, ідзі агонь тушыць!



Не ідзе вада агонь тушыць, не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакай жа, вада, нашлю я на цябе валоў... Валы, валы, ідзіце ваду піць!

Не ідуць валы ваду піць, не ідзе вада агонь тушыць, не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пачакайце ж, валы, нашлю я на вас доўбняў... Доўбні, доўбні, ідзіце валоў глушыць!

Не ідуць доўбні валоў глушыць, не ідуць валы ваду піць, не ідзе вада агонь тушыць, не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

Не ідуць чэрві камяні тачыць, не ідуць камяні тапары тупіць, не ідуць тапары доўбні секчы, не ідуць доўбні валоў глушыць, не ідуць валы ваду піць, не ідзе вада агонь тушыць, не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пастойце ж, чэрві, нашлю я на вас курэй... Куры, куры, ідзіце чарвей дзяўбаць!

Не ідуць куры чарвей дзяўбаць, не ідуць чэрві камяні тачыць, не ідуць камяні тапары тупіць, не ідуць тапары доўбні секчы, не ідуць доўбні валоў глушыць, не ідуць валы ваду піць, не ідзе вада агонь тушыць, не ідзе агонь вяроўкі паліць, не ідуць вяроўкі стральцоў вязаць, не ідуць стральцы мядзведзя біць, не ідзе мядзведзь ваўкоў душыць, не ідуць ваўкі казу есці. Няма казы з арэхамі, не ідзе каза дамоў.

— Пастойце ж, куры, нашлю я на вас каршуна... Каршун, каршун, ідзі курэй драць!



Пайшоў каршун курэй драць, пайшлі куры чарвей дзяўбаць, пайшлі чэрві камяні тачыць, пайшлі камяні тапары тупіць, пайшлі тапары доўбні секчы, пайшлі доўбні валоў глушыць, пайшлі валы ваду піць, пайшла вада агонь тушыць, пайшоў агонь вяроўкі паліць, пайшлі вяроўкі стральцоў вязаць, пайшлі стральцы мядзведзя біць, пайшоў мядзведзь ваўкоў душыць, пайшлі ваўкі казу есці.

Ёсць каза з арэхамі, прыйшла каза дамоў.

# Зайкава хатка

Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.

Жылі яны непадалёку адно ад аднаго. Прыйшла восень. Холадна стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкава — стаіць як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкаву хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася. Пайшоў зайка са свайго двара, сеў пад бярозкаю ды плача. Ідзе воўк. Бачыць — зайка плача.

— Чаго ты, зайка, плачаш? — пытае воўк.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адно каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я з труску-пяску, а яна з труску-



сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама ў ёй жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка. Пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з твае хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Воўк стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку:

— Чаго залезла ў чужую хату? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае воўку:

— Ой, воўк, сцеражыся: мой хвост як дубец — як дам табе, дык будзе канец.

Перапалохаўся воўк ды наўцёкі і зайку аднаго пакінуў. Сеў зноў зайка пад бярозкай ды горка плача. Ідзе праз лес мядзведзь. Бачыць — зайчык сядзіць пад бярозай і плача.

— Чаго, зайка, плачаш? — пытае мядзведзь.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адно каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала



мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з твае хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Мядзведзь стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку:

— Нашто адабрала ў зайкі хатку? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае мядзведзю:

— Ой, мядзведзь, сцеражыся: мой хвост як дубец — як дам, дык будзе табе канец.

Спалохаўся мядзведзь ды наўцёкі і зайку аднаго пакінуў. Зноў пайшоў зайка са свайго двара, сеў пад бярозкаю ды горка плача. Аж бачыць — ідзе праз лес пеўнік. Угледзеў зайчыка, падышоў і пытае:

— Чаго, зайка, плачаш?

— Ды як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адно каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць як стаяла. Прыйшла

лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: я выганю лісу з твае хаткі.

— Ой, Пеценька, — плача зайка, дзе табе яе выгнаць? Воўк гнаў — не выгнаў. Мядзведзь гнаў — не выгнаў.

— А вось жа я выганю. Пойдзем, — кажа пеўнік.

Пайшлі. Увайшоў пеўнік у хатку, стаў на парозе, кукарэкнуў, а потым як закрычыць:

Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

А лісічка ляжыць ды кажа:

— Ой, певень, сцеражыся: мой хвост як дубец — як дам, дык будзе табе канец.

Скочыў пеўнік з парога ў хату ды зноў крычыць:



Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

І — скок на печ да ліскі. Дзюбануў лісу ў спіну. Як усхопіцца лісіца ды як пабяжыць вон з зайкавай хаткі, а зайка і дзверы зачыніў за ёю.

І застаўся ён жыць у сваёй хатцы разам з пеўнікам.

# Як пеўнік ратаваў курачку

Жылі-былі пеўнік з куркаю. Пеўнік хадзіў жыраваць на гарохавішча, а курка — на бабовішча. Пеўнік гарох збіраў і гарохам сілкаваўся, і бяды з ім ніякай не здаралася, а курка дзеўбанула раз бабовінку і падавілася. Прыбег пеўнік курку ратаваць і рады даць не можа.

Пабег ён да мора вады прасіць.

— Мора, мора, дай вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

Кажа мора:

— Ідзі да япручка, няхай дасць ікол.

Прыбег пеўнік да япручка.

— Япручок, япручок, дай ікол.



— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

А япручок кажа:

— Ідзі да дуба, няхай дасць жолуд, прынясі мне яго, тады я дам ікол. Пабег пеўнік да дуба.

— Дубе, дубе, дай жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

— Ідзі да ліпы, няхай дасць мне пояс.

Пабег пеўнік да ліпы.

— Ліпа, ліпа, дай пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

А ліпа кажа:

— Ідзі да дзяўчат, няхай дзяўчаты саўюць мне вянок, тады дам паясок.

Пабег пеўнік да дзяўчатак.

— Дзяўчаткі, дзяўчаткі, спляціце вянок.

— Нашто вянок?

— Ліпе вянок, каб ліпа дала пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.





— Ідзі, пеўнік, да пастухоў, няхай пастухі дадуць нам малака. Як пад'ямо малака, тады саўём вянок.

Пабег пеўнік-небарака да пастухоў. Прыбег і кажа:

— Пастухі, пастухі, дайце малака.

— Нашто малако?

— Дзяўчатам малако, каб дзяўчаты вянок звілі.

— Нашто вянок?

— Ліпе вянок, каб ліпа дала пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

— Ідзі, пеўнік, да касцоў, няхай касцы накосяць сена.



Пабег пеўнік да касцоў на балота.

— Касцы, касцы, дайце сена.

— Нашто сена?

— Каровам сена, каб каровы далі малака.

— Нашто малако?

— Дзяўчатам малако, каб дзяўчаты вянок звілі.

— Нашто вянок?

— Ліпе вянок, каб ліпа дала пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

А касцы кажуць:

— Бяжы, пеўнік, да аратага, няхай араты дасць хлеба: як пад'ямо хлеба, тады накосім сена.

Пабег пеўнік да аратага.

— Араты, араты, дай хлеба.

— Нашто хлеб?

— Касцам хлеб, каб касцы накасілі сена.

— Нашто сена?

— Каровам сена, каб каровы далі малака.

Нашто малако?

— Дзяўчатам малако, каб дзяўчаты вянок звілі.

— Нашто вянок?

— Ліпе вянок, каб ліпа дала пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

— Бяжы, пеўнік, да каваля, няхай каваль нож зробіць, бо нечым хлеба адкроіць.

Памчаўся пеўнік да каваля.

— Каваль, каваль, дай нажа.



— Нашто нож?

— Аратаму нож, араты хлеба адкроіць.

— Нашто хлеб?

— Касцам хлеб, каб касцы, пад'еўшы, сена накасілі.

— Нашто сена?

— Каровам сена, каб каровы малака далі.

— Нашто малако?

— Дзяўчатам малако, каб дзяўчаты вянок звілі.

— Нашто вянок?

— Ліпе вянок, каб ліпа дала пояс.

— Нашто пояс?

— Дубу пояс, каб дуб даў жолуд.

— Нашто жолуд?

— Япручку жолуд, каб япручок даў ікол.

— Нашто ікол?

— Мору ікол, каб мора дало вады.

— Нашто вада?

— Курцы вада: ляжыць курка пад мяжою, не парушыць галавою, ні сапне, ні дыхне.

Зрабіў каваль нож і даў пеўніку.

Бяжыць пеўнік з нажом да led аратага.

Араты адрэзаў хлеба. Касцы наеліся хлеба, травы накасілі. Кароўкі, наеўшыся сена, малачка далі. Дзяўчаты напіліся малака, вянок звілі. Ліпа, узяўшы вянок, пояс дала. Дуб, дастаўшы пояс падпяразвацца, даў жолуд. Япручок, з'еўшы жолуд, ікол даў. Мора, узяўшы ікол, вады дало.

Бяжыць пеўнік з вадою на бабовішча. Паглядзеў, аж ад куркі адны толькі костачкі засталіся.

На гэтым і байка ўся. Зарэзала баба гуся. Баечніку дала кумпячок, а слухачу — трыбушок.

# Пчала і шэршань

Прыйшла вясна. Вырасла ў лесе пахучыя красачкі. Зацвіла чаромха ў гаі. Цёпла, весела. Зазвінелі камарыкі, мушкі. Замільгалі ў паветры матылькі. Вылецела пчолка з вулля. Палящела яна мядок збіраць. Збірае яна мядок, аж чуе — шэршань гудзе. Падлятае шэршань да пчолкі.

— Пчолка, будзь маёю жонкай.

— Пачакай, шэршню. Давай наўперад мёду прыстараемся, а на восень пажэнімся.

І паляцела пчолка на красачкі, мядок збірае.

Цэлае лета працуе яна, мядку прыпасае.

А шэршань цэлую ноч у гнілой асіне сядзіць. Дзень настане — выпаўзе з асіны, пагрэецца на сонцы, а потым у гай ляціць, сам нічога не робіць, пагульвае. І так прагуляў ён цэлае лета.



Прыйшла восень. Холадна стала. Павялі красачкі.

А пчолка мёду нанасіла і сама ляціць да шэршня.

Сядзіць шэршань на асіне каля дзірачкі. Холадна там. Адубеў шэршань, ляцець не можа.

— Ну, што, шэршань, будзем жаніцца? — пытае пчолка.

А шэршань толькі лапкамі паварушыў і піснуў:

— Не лезь, не лезь, бо ўдавою застанешся.

# Дудар

Хадзіў па свеце дудар. Ён умеў спяваць такія добрыя песні і так прыгожа граў на дудзе, што яго заўсёды слухалі з вялікай цікавасцю.

І далёка хадзіла па свеце слава аб гэтым дудары.

І калі гэты дудар з'яўляўся сярод людзей, то людзі сходзіліся да яго паслухаць песні.

Дудар спяваў славу свайму народу, пра яго радасці і гора і зваў людзей да лепшага жыцця, да змагання з тым злом, якое неслі іншыя людзі таму народу, да якога належаў і сам дудар.

Людзі чулі праўду ў песнях і ў музыцы дудара і слухалі яго.

Дачуўся адзін выдатны і багаты пан пра гэтага дудара.





Прывялі слугі дудара да пана.

— Хто табе даў права спяваць такія песні? — спытаў яго пан.

— Я спяваю тое, што ляжыць у мяне на сэрцы. Сэрца дадзена мне прыродаю, значыць, сама прырода дала мне і гэтае права. Я не магу пайсці супраць сваёй прыроды.

— Можа, твая і праўда, — адказаў пан: — але тады ты мусіш згадзіцца і са мною, бо мне таксама дала прырода сілу пасадзіць цябе ў склеп. Ты там спявай і грай на дудзе, колькі захочаш. А калі твае песні праб'юцца праз склеп і даляцяць да мяне, тады я дам табе права хадзіць па свеце і спяваць людзям песні.

— Панок, — прасіў дудар: — не рабі ты гэтага, не ідзі ты супраць прыроды!

Не паслухаў пан дудара і пасадзіў яго ў склеп. Дудар пачаў граць і спяваць свае песні ў глухіх мурах. Песні яго былі такія смутныя, што нават паветра плакала. Вецер падхапіў яго песні і панёс іх людзям. Знайшлі людзі



свайго дудара і вызвалілі яго, а ў склеп пасадзілі пана.

Праз больш-менш доўгі ці кароткі час людзі выпусцілі і пана. І сказалі яму:

— Наш дудар меў прыроднае права спяваць, і ты не мог мецъ над ім свае волі. І што дадзена чалавеку прыродаю, таго не адбярэ чалавек.

# Не вытрываў

Адзін пан вельмі любіў слухаць казкі. Многа перaслухаў ён гэтых казак. Урэшце захацелася яму пачуць такую казку, у якой не было б ніводнага слова праўды. Знайшоўся такі казачнік. І кажа яму пан:

— Вось талерка золата. Калі раскажаш мне такую казку, каб не было ў ёй ні слова праўды і каб я сказаў табе: «Лжэш», — дык тады аддам табе гэтую талерку золата.

Зірнуў чалавек на талерку — так і зіхціць на ёй золата!

І ён пачаў:

— Чаго, панок, на свеце не бывае. Вось са мною такая прыгода здарылася. Было мне гадоў пятнаццаць, але яшчэ на свет не радзіўся. Наняўся я да аднаго гаспадара пчол



пасвіць — пяцьдзясят раёў пчол. Рана і вечарам я павінен быў пералічыць іх, а вечарам іх трэба было і падаіць, і пазаганяць у вуллі.

— Свет вялікі, можа быць, і праўда, — кажа пан.

Глянуў казачнік на золата — блішчыць, на яго ліха!

— Раз выпусціў я пчол на пашу. Вярнуліся яны дамоў — дванаццаці пчол няма. Дзе ж яны падзеліся? Можа, у балоце загразлі... Кінуўся іх шукаць. Я туды, я сюды — няма. Аж бачу — адзінаццаць пчол ляцяць, параненыя, акрываўленыя. А дванаццатай няма. Ох ты, гора маё! Я далей.

— Го-го-го! — крычу.

— Гу-у-у-м, — адазвалася яна.

Зірк за рэчку — аж там чарада ваўкоў апанавала маю пчалу і душаць. А яна адбіваецца, а яна не даецца. Я, гэта, давай бегчы шпарчэй на падмогу. Да рэчкі дабег — перавозу няма! Спазнюся — задушаць яе ваўкі. Схваціў, гэта, я сам сябе за чупрыну, размахаў, разгойдаў —



гопта-ля-ля! Як штурхануў, так і перакінуўся на той бок ракі.

— Можа быць, — кажа пан.

— Але з разгону як гопнуў я аб зямлю, так па пояс і засеў! Я туды, сюды — не вылезу. Я так, я сяк — не бярэ. Без рыдлёўкі не зробіш нічога. Кінуўся я як мага дадому, схапіў рыдлёўку ды назад. Бягу, гэта, я, аж чую — у дупле печаныя дзятлы пішчаць. І так прынадна пахнуць! Палез я ў дупло. Лезу галавою — не ўлез, рукою лезу — не ўлез; лезу нагою — дарма! Калі ж кінуўся ўсім целам — улез! Паеў я тых дзятлаў, назад лезу. Лезу галавою — не вылезу, лезу рукою — не вылезу і нагою лезу — не вылезу.

Кінуўся ўсім целам — няма рады. Без сякеры нічога не будзе. Зноў дадому бягу, хватаю сякеру, лезу ў дупло, высякаю дзірку — вылажу. Бягу за рэчку, адкопваю сябе з зямлі і кідаюся пчале памагаць.

— Свет вялікі, можа быць, і праўда, — кажа пан.

— Праўда ці няпраўда, але прыбег я да пчалы, адагнаў ваўкоў. Бачу — не жыць маёй пчале. Я, гэта, нядоўга думаючы, шась яе нажом! Перарэзаў ёй горла. А крыві, крыві — аж рэчка зачырванелася. Абяліў я пчалу і прывёз мяса дадому: дванаццаць кадзей мяса наклаў!..

— Свет вялікі, можа быць, і праўда.

— Можа праўда, а можа, і няпраўда. Тут я ўспомніў, што косці засталіся на пожні. Думаю сабе — лаяць будуць людзі, што загрувасціў касцямі больш дзесяціны сенажаці. Пабягу ды скіну іх у раку. Прыбег. Стаў падымаць хрыбет з рэбрамі. Падняў я яго, потым як штурхану ад сябе!.. Я думаў, што ўпадзе ў раку, а ён адным канцом стаіць на зямлі, а другім у неба ўпёрся.

— Свет вялікі, можа быць, і праўда.

— Ну што ж? Праўда дык праўда.

Палез я па гэтым хрыбце на неба. Як лезці, дык лезці, і ўзлез. Бачу — у адной хаце застолле — святыя гуляюць.

— Можа, і праўда.



— Праўда праўдай, але віламі па вадзе пісана. Падняўся шум, крык. Ну, думаю, калі злавяць, кепска будзе. А тут аніяк не знайду таго месца, дзе хрыбет стаяў. Бачу — пілавінне ляжаць. Давай з пілавіння вяроўку віць. Звіў доўгую вяроўку. Завязаў адзін канец яе і стаў спускацца з неба па вяроўцы. Спусціўся да самага канца вяроўкі, а зямлі яшчэ няма. Што тут рабіць? Я, гэта, вазьму ды адрэжу зверху кусок вяроўкі, а знізу надтачу і спускаюся далей.

— Свет вялікі, можа, і праўда.

— Але, праўда. Стаў я, гэта, на зямлі. Бачу — не наша зямля. Агляну́ўся — пекла! Іду далей. Аж бачу — панскі бацька-нябожчык, абарваны, босы, такі галадранец, аж глядзець шкада. Стаіць, бедненькі, з пугаю, свіней пасе.

— Лжэш, хам! — крыкнуў пан.

А казачнік — цап за талерку з золатам ды за дзверы.

# Змест

Каза ў арэхах .......................................... 3
Зайкава хатка .......................................... 10
Як пеўнік ратаваў курачку ................ 16
Пчала і шэршань ................................ 25
Дудар .......................................................... 28
Не вытрываў........................................... 32

**Беларускія** народныя казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа : для дзяцей мал.
Б43 і сярэд. шк. узросту / маст. Алег Грубін. — Мінск : Звязда, 2025. — 40 с. : іл.
ISBN 978-985-575-671-3.

У кнізе змешчаны беларускія народныя казкі, апрацаваныя Якубам Коласам у 1922–1940 гг. Разнастайныя па тэматыцы, яны пазнаёмяць дзяцей з багатай прастора-й беларускага фальклору, са светаўспрыманнем нашых продкаў.

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44

Літаратурна-мастацкае выданне

**БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ**
**Ў АПРАЦОЎЦЫ ЯКУБА КОЛАСА**


Рэдактар *Н. Г. Шчарбакова*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Камп'ютарная вёрстка *К. А. Пігуль*
Стылістычны рэдактар *Н. Г. Шчарбакова*

Падпісана да друку 01.07.2025. Фармат $84\times100\,^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 3,90. Ул.-выд. арк. 1,69.
Тыраж 1000 экз. Заказ 577.

6+

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом «Звязда».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/8 ад 02.08.2013.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

Дзяржаўнае прадпрыемства
«БудМедыяПраект».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/42 ад 13.02.2014.
Вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

ISBN 978-985-575-671-3

